Hety Nr. „Bieł. Krynicy“ z dadatkam „Praleski“.

Cana 10 hr.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 23 (664). Wilnia, Niadziela 17 Traŭnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

„Народны Фронт“ і Беларусы

Скора ўжо год, як у палітычным сьвеце Эўропы пачаў тварыцца і разьвівацца так зв. «Народны Фронт». Прапанову тварыць яго падалі камуністы. Сутнасьць гэтага «фронту» ў тым, што камуністы, соцыялісты, розныя радыкалы, дэмократы і нават лібэралы маюць стварыць у Эўропе адну супольную палітычную арганізацыю дзеля барацьбы з фашызмам, імпэр'ялізмам, капіталізмам. Прычым, кожная такая палітычная група, якая далучаецца да агульнага «Народнага Фронту», не патрабуе выракацца сваей праграмы, сваей ідэолёгіі, ці хоць-бы нават зьмяняць яе. У нутры свайго палітычнага жыцьця кожная такая група астаецца аўтаномнай, а супольна з іншымі выступае процiў рознага роду фашызму.

Прычыны, якія змусілі камуністаў падаць думку супольнага «Народнага Фронту» і самым у такі „фронт“ уступаць, маюць характар унутраны камуністычны і міжнародны. Унутраны праявіўся ў тым, што ў партыі камуністаў аказаўся апошнімі гадамі вялікі застой, а міжнародны ў тым, што дужа крэпка ў Эўропе, асабліва ў некаторых дзяржавах, пачаў разьвівацца фашызм. З утварэньнем «Народнага Фронту» і з пашырэньнем яго антыфашыстоўскай дзейнасьці, камуністы сваю палітыку партыйную значна маглі-б ажывіць у нутры і пашырыць на міжнародным форуме.

Але гэткая камуністаў палітыка, як і палітыка агулам, гэта даволі рызыкоўная ігра, у якой можна выйграць, але можна так-жа й прайграць. Рызыка тут для камуністаў у тым, што гэткая іх палітыка супольнага „Народнага Фронту» зацірае вострасьць камуністычнай ідэолёгіі, згладжвае яе і самых камуністаў пакрысе «абуржоўлівае». Аднак яны гэтай рызыкі не баяцца і на супольны «Народны Фронт» ідуць усей парай.

Гэны, урэшце, «фронт» сапраўды стварыўся, разьвіваецца і ўжо ў Эўропе даў сусім рэальныя вынікі. Маем на ўвазе Гішпанію і Францыю, дзе пры выбарах у парлямэнт «Народны Фронт» атрымаў большасьць паслоў.

Нешта падобнае да «Народнага Фронту» разьвіваецца і ў Польшчы. Як ён тут, аднак, прадстаўляецца і хто ў яго ўваходзіць, сказаць напэўна трудна. Ведама толькі тое, што тут збліжаюцца да сябе рознага роду радыкалы: марксісты, людоўцы і інш. Гэты зародак «Народнага Фронту» ў Польшчы покульшто нічога пазытыўнага не даканаў, і, што найгалаўнейшае, ня выявіў дагэтуль бадай ніякай канкрэтнай праграмы.

Ведама, сам факт паўстаньня «Народнага Фронту» у Эўропе дужа характэрны і вялікага палітычнага значэньня. Дзеля гэтага адпаведна да яго аднесьціся павінны і беларусы. Пакульшто аднак ні адна з беларускіх палітычных груп дагэтуль афіцыяльна і выразна да «Народнага Фронту» сваіх адносінаў ня выявіла і не заняла ніякага становішча.

Факт гэты, відаць, тлумачыцца тымі палітычнымі варункамі, у якіх жывём, а прадусім, здаецца нам, гэта тлумачыцца тым, што «Народны Фронт» сам не заняў ніякага праграмнага становішча да праблемы адраджэнска-вызвольных імкненьняў недзяржаўных народаў. Дзеля гэтага беларусы агулам да гэтага „фронту“ адносяцца ўстрымана й крытычна. Прынамсі гэткае — дагэтуль, праўда, афіцыяльна так-жа ня выяўленае — становішча ў гэтай справе «Беларускага Народнага Аб'еднаньня».

І гэта сусім зразумела. Сусім што іншае ў дзяржаўных народаў, як напр. гішпанцы, французы, палякі, а што іншае ў нас, у беларусаў. Там агулам існуе фактычна толькі соцыяльная праблема, а ў нас і соцыяльная і нацыянальная. Беларускаму народу аднолькава ёсьць важнай як справа справядлівасьці соцыяльнай, так і нацыянальнай. Мы глыбока праканаваны, што соцыяльнае вызваленьне і нацыянальнае ў беларусаў ідуць з сабой упары і адно ад другога залежаць. Пэўне, раздзьмухваньне нацыяналізму, бяз увагі на праблемы соцыяльныя, ёсьць рэчай нямнога вартай, але барацьба выключна за справы соцыяльныя, бяз увагі на быт нацыянальны недзяржаўнага народу і бяз увагі на яго нацыянальную культуру, — так-жа ёсьць рэчай недастатачнай, бо ў апошнім выніку, звычайна, гэта робіць з народу і з тых клясаў, з якіх ён складаецца, асабліва з клясаў працоўных, матар'ял для пануючай ці агулам сільнейшай культуры.

Беларускі народ, такім чынам, у сяньнешні асабліва крытычны і важны час, павінен зорка сачыць за палітычнымі ў Эўропе падзеямі, берагчыся тых усякіх палітычных сіл, што нясуць яму такую ці іншую няволю і эксплёатацыю, а шукаць сваіх самастойных ідэолёгічных і практычных дарог і так-жа шукаць сабе саюзьнікаў прадусім у тых дэмократычных кругох, якія нясуць яму ідэі поўнага вызваленьня і самаазначэньня.

Урэшце агулам трэба адцеміць, што беларусы толькі ў такія палітычныя сувязі могуць уваходзіць, якія даюць ім магчымасьць весьці іх самастойную нацыянальную палітыку. Лучыцца толькі з праўдзівай дэмократыяй і трымацца на ўласных нацыянальных нагах. Усякія іншыя комбінацыі — сьмерці падобныя.

† Dr. Daniła Alsejka

9 traŭnia siol. h., majučy 53 h., u Litoŭskaj Poliklinicy ŭ Wilni pamior dr. D. Alsejka. Niabožčyk zaŭsiody cikawiŭsia biełaruskim adradženska-wyzwolnym rucham i sardečna jamu spryjaŭ. Užo dziela adnaho hetaha naležycca ad nas paświacić jahonaj pamiaci choć hetych niekalki zaciemak.

D. Alsejka radziŭsia 1881 h. u kalonii Urwis, Telšaŭskaha paw., byŭšaj Kowienskaj hub. Špiarša wučyŭsia ŭ miascowaj pačatkawaj škole, paśla ŭ Libaŭskaj i Maryjampalskaj himnazii. U 1910 h. skončyŭ medycynu ŭ Darpackim uniwersytecie i staŭsia doktaram medycyny.

Aprača swaich zaniatkaŭ lekarskich, dr. D. A. ad rańniaj swajej moładaści pracawaŭ u litoŭskim narodnym adradženskim ruchu. Jašče padčas zabarony carskaj uładaj litoŭskaha druku pisaŭ artykuły i wiestki ŭ „Vaspas“ i ŭ „Ukiniukas“, padpiswajučy ich mianiuškaj „Kukutis“.

U 1905 h. D. A. braŭ čynnaje ŭčaście ŭ wiedamym u litoŭskim palityčnym žyćci Wialikim Sojmie ŭ Wilni. Paśla hetaha praz niekatory čas prabywaŭ u roznych kutkoch našaha kraju, prawodziačy ahitacyju praciŭ carskich uładaŭ. Kali-ž u Wilni pačaŭ wychodzić časapis „Lietuvos Ukininkas“, dr. D. A. pracawaŭ tak-ža i ŭ im.

Padčas wialikaj wajny dr. D. A. prabywaŭ u Rasiei, biaručy dziejnaje ŭčaście ŭ litoŭskich biežanskich arhanizacyjach. Pad kaniec wajny razam z inšymi litoŭskimi lekarami dr. D. A. sarhanizawaŭ u Miensku tawarystwa litoŭskaj sanitarnaj Pomačy, jakoje paśla sarhanizawała Litoŭskuju Polikliniku. U 1918 h. heta tawarystwa i poliklinika pierajechała ŭ Wilniu, dzie ad taho času pracuje i pamysna raźwiwajecca i siańnia. Doŭhija hady hetaj polikliniki dr. D. A. byŭ dyrektaram, a ŭtrymliwajučaha jaje Sanitarnaha T-wa byŭ staršynioj až da samaj śmierci.

U Wilni dr. D. A. braŭ učaście ŭ litoŭskim hramadzkim žyćci. U 1918 h. byŭ jon kooptawany, jak pradstaŭnik narodnaj (sialanskaj) hrupy, u Litoŭskuju Dziaržaŭnuju Tarybu ŭ Wilni.

Paśla hetaha wyjaždžaŭ u Ameryku, dzie adwiedwaŭ litoŭskich emihrantaŭ, pracujučy siarod ich na karyść litoŭskaj adradženska-wyzwolnaj dumki.

U 1922 h. byŭ wybrany na staršyniu Litoŭskaha Nacyjanalnaha K-tu ŭ Wilni. Hetyja abawiazki spaŭniaŭ až da 1928 h. Paźniej hetaha-ž samaha K-tu praz paru hadoŭ byŭ zastupnikam staršyni.

U 1929 h., kali paŭstała ŭ Wilni litoŭskaje tawarystwa „Kultura“, byŭ wybrany na jaje staršyniu, jakim astawaŭsia až da 1934 h.

Jak užo skazana wyšej, dr. D. A., jašče budučy studentam, pisaŭ u litoŭskija hazety, što wychodzili ŭ Uschodniaj Prusii. Takžasama čas ad času pisaŭ i ŭ litoŭskija hazety ŭ Wilni, pierawažna ŭ „Viln. Aidas“.

U 1927—28 h. špiarša redahawaŭ i wydawaŭ ułasny časapis „Kelias“, a paśla „Viln. Šviesa“.

Naležyŭ da Litoŭskaha Nawukowaha T-wa ŭ Wilni, pisaŭ u orhanie hetaha T-wa „Lietuvos Tauta“. Pisaŭ urešcie, apošnim časam u časapisie „Viln. Žodis“. Napisaŭ tak-ža cely rad popularna-nawukowych prac z haliny historyi i medycyny.

Wyšej my skazali, što dr. D. A. byŭ pryjazny i da biełaruskaha adradženska-wyzwolnaha ruchu. Zbližyŭsia jon i paznaŭsia z hetym rucham najbolš padčas swajho ŭradawańnia na stanowiščy staršyni Lit. Nacyjanalnaha K-tu ŭ Wilni, asabliwa-ž u 1927 h., kali ŭsie nacyjanalnyja mienšaści ŭ Polščy wydawali ŭ polskaj, niamieckaj, francuskaj i anhlijskaj mowach supolny žurnał „Natio“, jakoha razam z inšymi byŭ jon wydaŭcom i ŭ jakim, wobak z artykułami pradstaŭnikoŭ inšych nacyjanalnaściaŭ, drukawalisia tak-ža i artykuły jaho ab pałažeńni litoŭskaha narodu ŭ Polščy.

Pachowiny adbylisia 11.V. na mohiłkach Piatra i Paŭła ŭ Wilni. Narodu za trunoj išło mnoha. Aprača litoŭcaŭ było niamała biełarusaŭ, palakoŭ, žydoŭ. Žałobnaja pracesija zajmała badaj kilometr darohi. Litoŭskaja moładź strojna piajała relihijnyja pieśni, z jakich asabliwa wydzialalisia dźwie, zharmanizawanyja Sasnoŭskim i Naujalisam.

Na mohiłkach paśla žałobnych malitwaŭ ad imia ŭsich prysutnych pramowiŭ proboršč kaścioła św. Mikałaja kun. K. Čybiras, koratka, ale jasna malujučy žyćcio, pracu, zasłuhi niabožčyka, dabratu i česnaść jahonaha charaktaru.

Hawaryŭ pramoŭca, i ślozy płyli z wačej pa twary jaho. Dy mnohija płakali, bolšaść prysutnych płakała. Heta byli ślozy pryznańnia dobramu i zasłužanamu čaławieku, što adyjšoŭ u krainu wiečnaści, heta byli ślozy ščyraha pa im žalu.

A woś užo i kapiec nad mohiłkaj z świežaha piasočku a na im całaja hara wiankoŭ, bolš 30, a siarod ich tak-ža wianok i ad Biełaruskaha Nacyjanalnaha K-tu ŭ Wilni.

Wiečareła. Kruhom świežaja zieleń, pach čaremchi, z miesta danosiacca hałasy žyćcia i radaści. I tak čaradujucca žyćcio i śmierć, śmierć i žyćcio, a hdzie-ž samo Žyćcio, a hdzie-ž sama Praŭda? U žyćci i ŭ śmierci razam.

U zadumie pakidajuć pawoli ŭsie świežuju mahiłu dr. D. Alsejki, usie raschodziacca; astajucca tolki pachilenyja nad mahiłaj, prytulenyja da siabie try ludzkija postaci. Heta žonka, dačka i syn. Ich žal, jašče bolšy, jašče hłybiejšy, pryroda sama niejki asabliwa balučy jamu nadała charaktar... Jany jašče jak-by čakajuć, jak-by chočuć jašče niešta dahawaryć, dakončyć, lahčej im było-b... Daremna! Dr. Daniła, jak wosk miakki i čutki na ludzkija patreby za žyćcia swajho, ciapier niamiłaserna maŭkliwy i spakojny.

Sudiev... Bywaj! Tegul bus lengva Tau Vilniaus žeme... Niachaj budzie Tabie lohkaj wilenskaja ziamla!...

A. Sakalinski.

Sutnaść hitleraŭskaha fašyzmu

Musolini i Hitler uwiali wialikija zamiašańni ŭ eŭrapejskaj, a nawat i ŭ suświetnaj palitycy. Dziela taho, što palityka Musoliniaha da nas, Biełarusaŭ, biespasredna nie datykaje, źwierniem tut uwahu na hałoŭnyja mety tolki palityki Hitlera — hitleroŭskaha fašyzmu. A heta dla nas, Biełarusaŭ, wielmi ważnaja sprawa i my nie pawinny adnosicca da ŭsiaho taho, što nawokał nas tworycca, biezučasna.

„Mein Kampf" — (Maja baraćba).

„Mein Kampf" (Maja baraćba) — heta knižka, jakuju napisaŭ Hitler, i ŭ jakoj padaje jon swaju prahramu. Knižka hena źjaŭlajecca „ewanelijaj" niamieckich nacyjanał-socyjalistaŭ i ŭ joj padany ŭsie žadańni Hitlera i meta hitleroŭskaha fašyzmu. Ciapier Hitler punkt za punktam, z niamieckaj systematyčnaściaj, prawodzić swaju prahramu ŭ žyćcio.

Pieršyja punkty hitleroŭskaj prahramy:

1) Zawiaści ŭ Niamieččynie ahulny abawiazak wajskowaje službv, jakaja była zabaronienaja Wersalskim Traktatam.

2) Adabrańnie kraju Saary.

3) Ahraničeńnie ŭ prawoch niamieckich žydoŭ.

4) Skasawańnie Lokarnaŭskaha dahaworu, jaki zabaraniŭ Niamieččynie trymać wojska ŭ pryhraničnaj pałasie z Francyjaj i Belhijaj.

Heta ŭsio Hitler užo asiahnuŭ.

Najhałaŭniejšyja mety hitleroŭskaha fašyzmu.

Najhałaŭniejšaj metaj hitleraŭskaha fašyzmu źjaŭlajecca — zabiaśpiečańnie Niemcam nowych ziamiel dziela kalonizacyi.

Hitler u swajej knižcy „Mein Kampf" piša — My (Niemcy) majem mnoha nasialeńnia, a mała ziamli. Što-ž rabić, kab niemcy, hetaja najlepšaja na świecie rasa, mahła množycca?

Na hetaje swajo pytańnie Hitler daje taki adkaz: astajecca adziny wychad — niamieckaja kalonizacyja na eŭrapejskim uschodzie. Kali-ž toj ziamli nia možna budzie ŭziać padobramu, dyk na heta-ž jość u nas kułak — kaža Hitler.

„Pieršy naš płuh, jaki ŭzhare hetyja ziemli — kaža Hitler — nazywajecca mieč".

Dzie Hitler šukaje nowych ziamiel dla niamieckaj kalonizacyi.

Hitler hetaj „nowaj" ziamli ŭ Rasiei aby dzie nia choča: ani nad Wołhaj, ani ŭ Sibiry, bo heta było-b zadaloka i mocna addzialała-b niamieckich asadnikaŭ ad ichniaha „faterlandu" (baćkaŭščyny). Jon choča ziamli dla niamieckaj kalonizacyi nia wielmi daloka ad Niamieččyny i pry hetym, kab „nowyja" ziemli byli tak-ža dahodnyja i z hledzišča stratehičnaha.

Swaje imperyjalistyčnyja mety Hitler tałkuje hetkaj filozofijaj:— Boh skazaŭ, što čaławiek musić wiečna barocca za štodzienny chleb. Hetym štodziennym chlebam dla Niemcaŭ jość ziamla, a pralitaja niamieckaja kroŭ atrymaje naharodu, kali rassielenyja na „nowaj" ziamli niamieckija asadniki buduć radzić dobrych niemcaŭ.

Nia treba nam — piša dalej Hitler — takich filozafaŭ, katoryja kažuć, što hetkaja wajna była-b narušeńniem prawa čaławieka. Hetkija filozafy tolki asłablajuć wolu narodu asiahnieńnia adzinaj mety — ziamli. Bo hranicy dziaržaŭ byli prawiedzienyja ludźmi i ludzi majuć prawa ich źmianić. A heta asiahajecca nie dabrawolna i nie sławami, ale tolki miačom.

Dalej Hitler piša: Daroha zdabyćcia „nowych" ziamiel dziela niamieckaj kalonizacyi pakazwaje nam sudźba; sławianie — heta nižejšaja rasa, jakaja biez niamieckaj arhanizacyi nia ŭmieje saboj kirawać.

U kancy Hitler u hetaj čaści swajej knižki, dzie piša ab kalonizacyi, daje swaim ziemlakom takoje palityčnaje nastaŭleńnie:

Dziaržawa, jakaja nia maje zabiaśpiečanaj ziamli na sotni hadoŭ, nia jość zabiaśpiečanaj. Najświaciejšaje našaje prawa — heta prawa na ziamlu, a najświaciejšaja achwiara — heta kroŭ, jakaja za henaje prawa pralivajecca...

Hetak u skaročańni pradstaŭlajecca prahrama hitleraŭskaha fašyzmu, pawodle jakoj Hitler maje wiaści niemcaŭ da zaŭładańnia „nowych" ziamiel. Jak bačym, hetaja prahrama naskroś imperyjalistyčnaja, abapiortaja na pahanskaj morali — prahrama miača, krywi i dzikoha nasilstwa nad druhimi narodami.

—s—

Treba wiedać, što hetaja prahrama Hitlera ciapier źjaŭlajecca palityčnym daroha-pakazčykam dla sučasnaj niamieckaj palityki. Pieršaja ŭstupnaja jaje časć, jakaja adnosicca da spraŭ unutranych i da zachodnich susiedziaŭ, užo wykananaja. Ciapier, jak widać z nastaŭleńnia całaści sučasnaj hitleraŭskaj zahraničnaj palityki, hitleraŭski fašyzm padhataŭlajecca da wykanańnia druhoj, hałoŭnaj časci swajej prahramy – zdabyćcia „nowych" ziamiel na eŭrapejskim uschodzie dziela niamieckaj tam kalonizacyi.

Słowam, Hitler choča dakanać na eŭrapejskim uschodzie toje, što dakanaŭ Musolini ŭ Afrycy. Nu, ale ŭschodnia-eŭrapejskija dziaržawy i narody — heta nie dziaržawa abisynskaha negusa i nie etijopy z askaryjcami. Dyk tut Hitler moža nia tolki što ničoha nie dastać, ale i zusim sabie haławu skrucić.

p—k.

† 10 traŭnia 1936 h. u w. Ciacierkach, Brasłaŭskaha paw., paśla doŭhich i ciažkich ciarpieńniaŭ pamior majučy 70 hadoŭ

Jazep Piaciukiewič

—stary i zasłužany wiaskowy pracaŭnik na hruncie biełaruskaha narodnaha ŭświedamleńnia.

Pawiedamlajuć u smutku
Žonka, Dačka i Syny.

Hadaŭščyna śmierci marš. J. Piłsudskaha

Pachowiny serca J. Piłsudskaha ŭ Wilni.

Sioleta 12 traŭnia minuŭ hod času paśla śmierci I maršała Polščy Jazepa Piłsudskaha. U hety dzień — 12 traŭnia ŭsia Polšč ładziła chaŭturny ŭspamin pa Piłsudskim. U Wilni ŭ hety dzień adbylisia pachowiny na mahiłkach Rossa serca J. Piłsudskaha i pierawiezienych z Litwy astankaŭ matki Piłsudskaha.

Pachowiny serca i matki J. Piłsudskaha adbylisia wielmi ŭračysta. Usia Wilnia była spawita žałobnymi aznakami i ściahami, jakija pakrywali damy i kaścioły i dekorawali hałoŭnyja wulicy, katorymi prachodziŭ chaŭturny pachod. Na čale pracesii za kryžam išli ŭ kaścielnych ubiorach katalickija biskupy; urnu z sercam J. Piłsudskaha na lektycy (specyjalnych nasiłkach) niaśli hienerały; trunu z astankami matki Piłsudskaha wiaźli na harmacie. Na čale pachodu jšoŭ prezydent Polščy praf. Maścicki, za prezydentam polski ŭrad na čale z premjeram Kaściałkoŭskim. Dalej išli: hieneralicyja, duchawienstwa roznych wierawyznańniaŭ, akademickaja profesura, pradstaŭniki wajskowaści, pradstaŭniki inšych farmacyjaŭ, pradstaŭniki prawincyjanalnyja i pradstaŭniki mnohich arhanizacyjaŭ.

Padčas pachowinaŭ serca i matki J. Piłsudskaha na Rossie prezydent praf. Maścicki skazaŭ pramowu, jakaja była pieradana pa radyjo.

Nad mahiłaj serca J. Piłsudskaha dana 101 harmatni wystreł i paśla relihijnych malitwaŭ chaŭturnaja ŭračystaść zakončana.

KATALOH biełaruskich knižak na žadańnie wysyłajecca DARMA.
Adrasawać: Biełaruskaja Kniharnia «PAHONIA»
Wilnia, Zawalnaja 1–1.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Агульны Гадавы Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, як усім ужо ведама, зьяўляецца прадстаўніцтвам беларускага незалежнага арганізаванага грамадзянства ў Рэчыпаспалітай. Бел. Нац. К-т гуртуе беларускія палітычныя, культурныя, гаспадарчыя і інш. арганізацыі, а згодна з сваім рэгулямінам, што-год вясной абнаўляецца. Сёлета абнова гэта ўжо адбылася, а пасьля яе 10-га траўня адбыўся Агульны Гадавы Сход Камітэту. На сходзе гэтым былі рэпрэзэнтаваныя амаль усе беларускія арганізацыі і інстытуцыі, належачыя да БНК-ту.

Сход адчыніў дасюлешні старшыня БНК-ту рэд. Я. Пазьняк, каторы так-жа прачытаў мандаты дэлегаваных у К-т прадстаўнікоў. Пасьля, на старшыню сходу быў выбраны мгр. Я. Шутовіч, а на сакратара рэд. Я. Найдзюк.

Прадбачаную ў парадку дня справаздачу з дзейнасьці Прэзыдыюму БНК-ту за 1935-36 год здаў грам. Я. Пазьняк. З яе мы даведаліся, што Прэзыдыюм у гэтым годзе адбыло 7 паседжаньняў, а так-жа, што ў меру сіл і магчымасьцяў працавала на карысьць Беларускага Народу, памятуючы аб яго правох, аб патрэбе палепшаньня яго нага эканамічнага палажэньня, а таксама аб патрэбе асьветы і роднае беларускае школы.

Выслухаўшы справаздачу грам. Я. Пазьняка, сход прыняў яе да ведама і ўступаючаму Прэзыдыюму даў абсолюторыюм.

Пасьля гэтага на старшыню БНК-ту на 1936-37 г. выбраны інж. А. Клімовіч, а на сяброў Прэзыдыюму БНК-ту — інж. Л. Дубейкаўскі, др. Ст. Грынкевіч, рэд. Я. Пазьняк і мгр. М. Шкялёнак.

У канцы былі абгаворваны: сучаснае палажэньне Беларускага Народу і сучаснае палітычнае палажэньне агулам. У выніку шырокае і рэчовае дыскусіі сход пастанавіў прыняць у гэтай справе адпаведную рэзалюцыю, аканчальнае апрацаваньне якое даручана было новавыбранаму Прэзыдыюму. Апрача гэтага сход прыняў пастанову, каб сьвяткаваньне ўгодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ладзіў Беларускі Нацыянальны Камітэт у той дзень, у які яны прыпадаюць, гэта значыць 25-га сакавіка.

Паседжаньне Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту. 10 г. м. пасьля Агульнага Гадавога Сходу Бел. Нац. К-ту ў Вільні адбылося першае паседжаньне новавыбранага Прэзыды-

Міхась Машара.

Лёгкі хлеб.

4)

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

Зьява 9-я.

Тыя-ж і Пятрусь.

Пятрусь — (*Зачыняючы дзьверы і ня гледзячы на сцэну*). Ведаеш, — не знайшоў, нідзе не знайшоў! Па ўсей вёсцы бегаў! Бяз крыжа прапаў. (*убачыўшы Васіля*) А, ён тут! Дык, як мы разьмінуліся? Мо' я перашкодзіў, дык даруйце, калі ласка.

Васіль — Нікому ты не перашкодзіў. З гэтага сакрэту мы ня робім. Бачыш, я пасватаўся да Ганулькі і атрымаў згоду.

Пятрусь — (*вясёла*) Вось як! Які ты хуткі! Ну, братка, віншую! (*жме яму руку*) Шчыра віншую! Жадаю ўсяго добрага!

Васіль — Дзякую!

Пятрусь — (*да Ганулькі*) Ну што? Даведалася? Казаў-жа табе, што шчасьлівая, ці-ж ня праўда? Ну, жадаю шчасьця! Ну і каб што-год, ды новы...

Ганулька — (*Перабіваючы*) Годзі, годзі! Кінь Пятрусёк жарты, а за павіншаваньне дзякую.

Васіль — Ведаеш, дарагая, я маю надта кароткі час: хутка трэба ізноў вяртацца ў места, дык робім сяньня заручыны. (*да Мар'яны*) Ці мама супроць гэтага нічога ня мае?

Мар'яна — Рабеце, дзеткі, як вам ляпей.

Ганулька — Я сваё таксама ўжо сказала. Рабі, як лепш.

Васіль — (*Да Пятруся*) Дык вось, Пятрусь, будзь у мяне дружкам! (*бярэ яго пад руку і адходзіць на бэк і штось ціха гаворыць. Ганулька штось ціха гаворыць матцы! Мар'яна выходзіць*).

Пятрусь — (*адходзячы*) Добра, добра, усё зробім.

Зьява 10-я.

Васіль і Ганулька.

Васіль — (*Сядаючы на лаўцы з Ганулькай*) Як усё добра складаецца. Хутка ты будзеш маей. У места я ўжо вярнуся з табой. Скажы, любая, ты не шкадуеш кідаць вёскі? Цябе ня страшыць места?

Ганулька — Не... анітрошкі! З табой мне ня страшна нідзе.

Васіль — Я яшчэ адно павінен сказаць, што жыцьцё маё, на якое заву цябе... жыцьцё, як і наагул працоўных людзей ня ёсьць лёгкім. Мае шмат перашкодаў і няпрыемнасьцяў. Заву цябе, разам працаваць і змагацца з перашкодамі нашага жыцьця.

Ганулька — Гэта мяне ня страшыць, Васіль. Ты бачыш, я не паненка. Працаваць і жыць з табой і для цябе, ці ж яшчэ патрэбна чаго да майго шчасьця? Лёгкі хлеб, на які так ласы нашы „цілігэнткі," якога яны шукаюць у замужжы, мяне не спакушае.

Але страшыць мяне іншае, Васілёк!

Васіль — Што такое, дарагая?

Ганулька — Тое, што я вясковая, неразьвітая дзяўчына і спаміж мястовых тваіх знаёмых буду выглядаць надта няцікава, і табе надта часта будзе сорамна за такую жонку.

Васіль — Якія ты недарэчнасьці прыпушчаеш, дарагая. Ты думаеш, што я ў месьце жыву з нейкімі панамі? Не, дарагая, сяньнешняе места дзеліцца, пераважна, на дзьве варожыя сабе часткі:

Да аднэй належаць людзі, якія нічога ня робячы, ня ведаюць ліку свайму багацьцю. Людзі — паны, якім усё жыцьцё сплывае цудоўнай казкай. Людзі — карыстаючыя з чужога мазаля.

Да другой — працоўныя з сваей інтэлігенцыяй, якая цесна зьліта з працоўнай масай. Гэта павадыры яе ў змаганьні за лепшую будучыню, якія добра ведаюць, як цяжка здабыць адукацыю.

І мне ня прыдзецца чырванець за цябе, у кругу тых людзей, з якімі я жыву і працую.

Але цябе гэта нудзіць?

Ганулька — Не, любы, мяне ўсё цікавіць, што зьвязана з табой і тваім жыцьцём.

Зьява 11-я.

Тыя-ж і Рыгор.

Рыгор — (*уходзячы*) Пахвалёны Езус! (*разглядаючыся*) Як той казаў, адны маладыя, а дзе-ж старая дзелася?

Васіль — А.. тата прыйшоў! Вось добра! (*устаюць і ідуць да яго*).

Рыгор — Ды вось прыбег-жа, як той казаў, гэты Пятрусь Янкаў. Прычапіўся, як той казаў, ідзі, ды ідзі да Мар'яны — Васіль — кажа — цябе заве. Кажа — надта справа пільная. А што за справа, дык багавіца яго ведае, так і не дапытаўся. (*да Васіля*) Дык кажы, як той казаў, навошта я табе так пільна патрэбны?

Васіль — А вось бачыш, тата, я — жанюся... Бяру за жонку Ганульку, ці добра? Ну і сяньня робім заручыны, дык вось і паслалі за табой.

Рыгор — Багавіца вас, а мне што? Я стары... Мой век — час, як той казаў. Каго возьмеш, з тым і жыць будзеш Хоць у нашыя часы, як той казаў, не рабілі гэтак; — не прысылалі за бацькамі, як той-казаў, тады, як усё зроблена. Ды што-ж цяпер усё пановаму, як той казаў... Мо' гэтак і трэба?

юму гэтага Камітэту, на якім сябры яго падзялілі паміж сабой функцыі. Цяперашні Прэзыдыюм БНК-ту выглядае гэтак: інж. А. Клімовіч — старшыня, інж. Л. Дубейкаўскі і мгр. М. Шкялёнак — віцэ-старшыні, др. Ст. Грынкевіч — скарбнік і рэд. Я. Пазьняк — сакратар.

Паседжаньне Прэзыдыюму Ц.К. БНА. 11 г. м. ў Вільні адбылося паседжаньне Прэзыдыюму Цэнтр. К-ту Беларускага Народнага Аб'еднаньня, на якім было разглядана пісьмо сяброў Рады БНА — др. Я. Малецкага, А. Шутовіча, Я. Багдановіча і Б. Гапановіч-Бабарыкі ў справе папраўак пр(а)грамы БНА. Пастановы ў гэтай справе будуць апублікаваны пасьля.

Змаганьне за родную школу. „Шлях Моладзі" — орган беларускае моладзі — у № 4 (90) сёлета піша, што: „У вёсцы Запольле, Карэліцкае валасьці, Навагрудзкага павету, сяляне перасталі пасылаць дзяцей у пачатковую польскую школу і дамагаюцца школы беларускай. Дзеля гэтага, каб сяляне пусьцілі сваіх дзяцей у школу польскую, робіцца розныя „загады", аднак сяляне ўпорыста стаяць пры сваіх дамаганьнях роднае школы!..."

Новы гурток БІГІК. У в. Сенкевічы, Косаўскага пав. гэтымі днямі заснаваўся новы гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Гэтымі днямі выйдзе з друку кніжка 2(6) беларускага літаратурна - навуковага часапісу

„Калосьсе"

Кніжка зьмяшчае: у аддзеле прыгожага пісьменства — творы Максіма Танка, Васілька, Міхася Машары, Натальлі Арсеньневай, А. Бароўскі і іншых, у аддзеле навукі і крытыкі — артыкулы А. Станкевіча, Ад. Саладухі, д-ра Ст. Грынкевіча, м-гра Аленькі, Р. Шырмы, П. Сергіевіча і інш. У хроніцы — многа цікавых вестак з беларускага культурнага жыцьця з таго і гэтага боку рыскай граніцы.

Выпісывайце і чытайце. Складка на „Калосьсе" ў год — 4 зл., на асобную кніжку — 1 зл. Адрас рэд. і адм. „Калосься": Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Z hramadzka-palityčnaha žyćcia ŭ Polščy

U polskich konserwatyŭnych kruhoch trywoha. Razwał sanacyi, dziakujučy katoraj jany prajaŭlali swaje ŭpływy ŭ hramadzkim žyćci, i ładžańnie h. zw. „narodnaha frontu" na adcinku polskaj lewaj apazycyi dy załoty P.P.S. (Polskaja Partyja Socyjalistyčna) da polskich sialanskich partyjaŭ — usio heta biantežyć i wywodzie z roŭnawahi konserwatystaŭ. Poruč z hetym uzmahajecca aktyŭnaść endecyi i jaje dabudowak.

Ab hetym krakaŭski konserwatyŭny „Čas" piša:

„Supolny front lewicy jość faktam dakananym, kali jdzie ab moładź. Starejšyja pojduć biassumniwu za prykładam maładych".

Heta adzin front. Jość jašče i druhi — nacyjanalistyčny.

Ab im „Čas" piša hetak:

„Centry nacyjanalistyčnaha frontu dasiul mała skrystalizawanyja. Ale jany isnujuć. Ichnija prapahanda pašyrajecca. Rewalucyjny nacyjanalizm wykarystywaje isnujučyja nacyjanalnyja nastroi. U endecyi, jakaja pakulšto trymaje wonkawy wyhlad adnalitaj celaści, musić pryjści da asnaŭnoha padziełu. Jaje demokratyčnaja častka nia zmoža dalej iści razam z nacyjanalistyčnymi rewalucyjanerami".

„Abodwa hetyja fronty wiaščiać miž saboju zaŭziatuju barećbu".

Na heta hledziačy, konserwatysty ŭ swajej hazecie „Čas" zaklikajuć da arhanizacyi treciaha frontu,—prawaha h. zn. pamiarkoŭnych endekaŭ z konserwatystami.

PPS. ab „narodnym froncie".

Nadowiačy ŭ Waršawie adbylisia narady Hałoŭnaj Rady P.P.S. Hetyja narady ŭzbudzili zacikaŭleńnie z pryčyny raspaŭsiudžańnia wiestak ab utwareńni h. zw. „narodnaha frontu", a tak-ža z pryčyny adnalitaha pachodu rabotnickich arhanizacyjaŭ sioleta ŭ pieršamajskim świecie.

Hałoŭnaja Rada P.P.S. wydała rezalucyju, u jakoj zaznačaje, što supracoŭnictwa P.P.S. z polskaj Kamunistyčnaj Partyjaj z pryčyn razychodžańnia ideołohičnaha i z uzhladu praktyčnaha niemahčymaje. Pry hetym Rada P.P.S. zaznačaje, što staić na stanowiščy h. zw. paktu nieagresii z kamunistami h. zw. niezawastrańnia suadnosinaŭ unutranych u rabotnickim ruchu. Adnačasna Rada P.P.S. padčyrkwaje swaju hatoŭnaść da supracoŭnictwa z usimi inšymi partyjami socyjalistyčnymi, a tak-ža sialanskimi i partyjami narodnych mienšaściaŭ, utwarajučy supolny front sialan i rabotnikaŭ u Polščy.

Aktyŭnaść „Stronnictwa Ludowaha".

Apošnimi časami polskaja sialanskaja partyja „Stronnictwo Ludowe" pačeła ładzić pa siołach sabrańni i arhanizawać swaje addziely. Sabrańni hetaj partyi adbywajucca ŭsiudy spakojna i nichto ichnij pracy nie pieraškadžaje.

Italija pryswoiła Abisyniju

Paśla razhromu italijancami abisynskaj abaronnaj armii italijanski karol wydaŭ hetki dekret:

Terytoryja i nasielnictwa Abisynii pierachodzić pad poŭnuju suwerennaść italijanskaha karaleŭstwa, karol Italii i jaho naśledniki buduć mieć tytuł cara Abisynii. Wice-karalom Abisynii abwieščany marš. Badoglio, jaki zawajawaŭ biezbaronnuju Abisyniju.

Treba adznačyć, što hety dekret karala padyktowany h. zw. Wialikaj Fašystoŭskaj Radaj.

Takim čynam wajna-bojnia ŭ Afrycy ŭžo končana. Ale heta jašče nia značyć, što italijanskija fašysty ŭžo mohuć tryŭmfawać. Jašče da zaŭładańnia zawajawanym krajem treba zhody inšych dziaržaŭ. Ciapier pačnucca dyplomatyčnyja i palityčnyja kłopaty dla italijanskich fašystaŭ, kab dabicca pryznańnia swaich pretensijaŭ da Abisynii.

Aneksija Abisynii i Liha Narodaŭ

Zbližanyja kruhi da Lihi Narodaŭ wykazwajucca, što negus (car) Abisynii dalej maje prawa pasyłać swaich pradstaŭnikoŭ u Lihu Narodaŭ, bo adnastaronnaje rašeńnie italijanskaha ŭradu nia moža źmianiać praŭnaha stanu. Negus maje namier, nawat i sam asabista, baranić u Eŭropie niezaležnaść Abisynii.

U suwiazi z hetkaj pastanoŭkaj sprawy, italijanski ŭrad adklikaŭ swaich pradstaŭnikoŭ z naradaŭ Rady Lihi.

Słowam, dla Italii kłopaty ŭ Eŭropie pačynajucca.

БЕЛАРУСЫ! Дамагайцеся для сваіх дзяцей школы ў роднай мове — падавайце школьнаму інспэктару дэклярацыі на беларускую школу.

Roznyja wiestki

Apelacyjny sud nad Banderaj, Łebedam i inš. Na pačatku traŭnia sioleta adbyŭsia ŭ Waršawie apelacyjny sud nad 12 ukraincami, abwinawačanymi ŭ zabojstwie min. Pierackaha. Paśla razhladu sprawy, Sud pacwierdziŭ papiaredni prysud 9-om zasudžanym i źmianiŭ prysud tolki trom asobam: padsudnamu Čorniju, zasudžanamu na 4 hady, źmienšyŭ karu na padstawie amnestyi da 2 hadoŭ, padsudnaj Zaryckaj źniziŭ z 6 hadoŭ kary da 4 let i taksama źmienšyŭ karu da 4 hadoŭ zasudžanamu Raku. Zasudžanyja padali kasacyjnuju skarhu.

Prysud na karu śmierci ŭ Łucku. Akružny sud u Łucku zasudziŭ 22 krasawika sioleta Branisława Kanopku na karu śmierci cieraz pawiešańnie za toje, što ŭ śnieźni miesiacy min. hodu jon spaliŭ u wioscy Andrejeŭcy ŭ Łuččynie siamju Pijakoŭ; chočučy ich abrabić, znajšoŭ jon tolki ŭsiaho 50 hr. i za hetyja 50 hr. spatkaŭ jaho prysud na karu śmierci.

Z POLŠČY

Dekret ab arhanizacyi armii. Prezydent Polščy 9 h. m. wydaŭ dekret, jaki ŭstanaŭlaje Kamitet abarony Rečypaspalitaj i arhanizuje wiarchoŭnaje kiraŭnictwa armijaj ŭ mirnym časie. Pawodle hetaha dekretu hałoŭnaje kiraŭnictwa zbrojnaj siłaj u Polščy naležyć da Prezydenta, jaki paklikaje da kiraŭnictwa Inspektara Zbrojnaj Siły i Ministra Wajskowych Spraŭ.

Daŭhi Polščy. Pawodle danych hałoŭnaha statystyčnaha ŭradu, polskaja dziaržawa mieła zahraničnych i ŭnutranych daŭhoŭ na 1 studzienia sioleta hetulki — 4.756.811.000 zł. U paraŭnańni z minułym hodam hetyja daŭhi ŭzraśli na 65 milijonaŭ zł.

Antysemickija zabureńni ŭ Waršaŭskaj Politechnicy. Niadaŭna ŭ Waršaŭskaj Politechnicy pamiž studentami dajšło da wostrych antysemickich zabureńniaŭ, padčas jakich mocna pabita niekalki dziesiatkaŭ studentaŭ-žydoŭ. Z pryčyny hetych zabureńniaŭ pa zahadu rektara zaniatki ŭ Politechnicy prypynieny na nieabaznačany čas.

Z ZAHRANICY

Wajskowaje zbližeńnie miž SSSR i prybaltyckimi dziaržawami. Hazety padajuć, što kiraŭniki hieneralnych štabaŭ Litwy i Łatwii zaprasili pradstaŭnikoŭ sawieckaj armii paznajomicca z wojskami ichnich dziaržaŭ. Hazety padajuć, što byccam u Litwu wybirajecca asobnaja balšawickaja wajskowaja delehacyja, jakaja maje paznajomicca z litoŭskaj armijaj

---

Васіль — Ну вось тата і крыўдзіцца, але ведаеш, усё так склалася неспадзявана. Адходзячы з дому, я і сам не прыпушчаў, што зраблю сяньня заручыны.

Рыгор — Добра, добра! Ядно — Ганульку бярэш; дзеля яе, як той казаў, усё можна выбачыць. Багавіца вас,—жывеце, дай Бог шчасьце! Надта яна мне, як той казаў, да спадобы. *(Ганулька цалуе яму ў руку)*

Зьява 12-я.

Тыя-ж і Мар'яна.

Мар'яна — *(да Рыгора)* Дык сядайце, кум, калі ласка, чаго стаіце?

Рыгор — А,... кума! А табе-ж яны, як той казаў, ці казалі што? Бачыш багавіца іх, — жэняцца! А бацька нат' нічога і ня ведае. Бацьку ўжо пасьля клічуць, як той казаў, на заручыны.

Мар'яна — Дзе там, кумок, толькі вось нядаўна і даведалася. Мяняюцца часы, кумок, мяняюцца... і людзі мяняюцца. Самі... без бацькоў. Самі ўсё склалі, ды й цалуюцца па кутках, а ў бацькоў і запытацца ня трэба. Усё сакрэты.

Ганулька — *(якая падчас гутаркі Мар'яны в Рыгорам, штось ціха гаворыць з Васілём)* Ужо і па кутках! Зусім не па кутках! А мама калісь тату не цалавала?

Мар'яна — Цалавала, цалавала! Я нябожчыка, вечны пакой, аж пакуль у сваты ня прыехаў, нават і ня бачыла. А каб пакойніца матка засьпела гэтак, як я цябе цалуючыся з Васілём, дык спачатку касу выдрала-б, а потым замуж пусьціла-б.

Рыгор — Вось аб гэтым, кума, аб гэтым. Я, як той казаў, да самых сватоў свайму Пятрусю праз бацька-нябожчык з кірмашу, ды й кажа, як той казаў, — ну сынок жаніцца табе час Я ўжо і жонку табе прыгледзіў і з бацькамі ўжо перагаварыўся, дык у суботу зьбірайся, — у сваты паедзем. — Я запытаўся, як той-казаў, адкуль, хто, якая? А бацька кажа — даведаешся, як паедзем, а пазнаеш, як прыедзем, — і годзі, як той казаў, больш і гутарыць ня стаў.

Ядно, — дзякаваць Богу, нябожчыца добрай маладзіцай была. Нашто казаць, хоць сьпярша, як той-казаў, і нянадта падабалася мне... Ды потым — прывыклі. Дзеці пайшлі і жылі, як дай Бог кожнаму.

А цяпер падругому, як той казаў, пановаму. Але, багавіца іх, сабе як зробяць, так і мець будуць.

Зьява 13-я.

Тыя-ж і Пятрусь, музыкі і вясковая моладзь.

Моладзь уходзіць у хату сьпяваючы песьню.

Пятрусь — *(увайшоўшы)* Вось і мы! Што, зачакаліся? О, як бачу, уся сямейка у поўным камплеце! Адной толькі дружкі не хапае! Затое я забегаўся, пакуль наледзіў усё. *(падходзіць да стала)* Ганулька, што-ж стол не засланы? Нясі, братка, хлеб-соль, ды будзем пачынаць.

Мар'яна — Пачакай, пачакай крыху, Пятрусёк! Загаварыліся мы тут. *(Мар'яна выходзіць у кухню. Моладзь вітае маладых. Вясёлы настрой — сьмех, жарты. Рыгор садзіцца на лаве і ванурывае люльку. Пятрусь стаўляе пасярод хаты стол. Музыкі ладзяць скрыпку і цымбалы).*

Мар'яна — *(выносіць з кухні абрус і хлеб)* Ганулька, ідзі дачушка, вынясі закуску! *(Ганулька і пара дзяўчат выходзяць у кухню. Мар'яна засьцілае стол).*

Пятрусь — *(ставячы на стол бутылкі з гарэлкай)* Цётка Мар'яна, нясеце чаркі!

Мар'яна — Пачакай, пачакай, Пятрусёк! *(дзяўчаты выносяць з кухні закуску і ставяць на стол)* А дзе Ганулька?

Голас дзяўчыны — Што трэба, цётка? Ганулька апранаецца.

Пятрусь — Ну што, Васіль, пачынайма, ці што?

Васіль — *(да моладзі)* Дык сядайма! *(Ганулька выходзіць, апранутыйся ў белую сукенку. Музыкі пачынаюць іграць. Васіль падходзіць да Ганулькі, бярэ за руку і ідуць да стала.*

Пятрусь — Ну і пара з вас! аж сэрца цешыцца.

Ганулька — Не хвалі ўвочы! Пятрусь сяньня за надта вясёлы настрой мае.

Пятрусь — *(Ганульцы)* Бо на сэрцы кошкі скрабуць. Ведаеш, сяньня і Верачку будуць заручаць. Гэны, гэны праклятый Крук, каб яму пуста было!

(Садзяцца за стол... Навакол абсядае моладзь. Усе маюць вясёлы настрой).

Пятрусь — *(падходзячы да Рыгора, які ўсьцяж курыць, седзячы на лаўцы)* Дзядзька Рыгор, кіньце вашую люльку, пойдзем да стала. *(да моладзі)* Гэй, рыхтуйце там месца! Самае пачэснае месца найстарэйшаму свату! *(ля маладой робяць месца).*

Рыгор — *(падходзячы да стала)* А багавіца вас, як той казаў, сядзіце, сядзіце! Я дзесь тут вось, як той казаў, з боку прыткнуся *(хоча сесьці з краю лавы).*

Пятрусь — Дзядзька Рыгор, ня рабіце нам сораму. Мы ведаем, дзе вашае месца. Вашае мейсца між намі, як будучай дачкі!

Васіль — А дзе-ж матка?

Ганулька — Пэўна ў кухні, штосьць прыбірае.

Васіль — Трэба схадзіць па яе. *(устае*

i razhledzić mahčymaści jaje reorhanizacyi i razbudowy.

Niakulturny handal u SSSR. Z kožnym dniom kamunisty ŭ Sawietach uściaž dalej adstupajuć pad naporam žyćcia ad swajej teoryi. Apošnim časam pierakanalisia jany, što ichni handal staić na nieadpawiednim kulturnym uzroŭni, što ichnija kooperatywy pracujuć biazdušna, jak miortwyja mašyny i nia majuć jany najbolš patrebnych tawaraŭ, jak soli, cukru, zapałkaŭ i inš. Dziela hetaha sawiecki kamisar handlu prystupiŭ da prawiadzieńnia adpawiednich reformaŭ, jakija ažywili-b, paprawili-b i zrabili-b sawiecki handal bolš kulturnym, jak kaža zastupnik kamisara handlu.

Unutranaja wajna ŭ Mandžuryi Pawodle hazetnych wiestak, u Mandžuryi zaharełasia ŭ pieršaj pałowie minułaha miesiaca ŭnutranaja wajna pamiž kitajskim partyzanckim 5000 addziełam i japonska-mandžurskim wojskam. U niekalkich miescach adbylisia krywawyja bai, u katorych paŭstancy razhramili častku japonska-mandžurskaj armii, zdabyli mnoha aružža i zaniali niekatoryja miascowaści z haradami. Da paŭstancaŭ dałučajecca mnoha kitajskich sialan.

22 milijony biezrabotnych na całym świecie. Mižnarodnaje Bluro Pracy padaje, što na świecie jošć ciapier 22 milijony zarejestrawanych biezrabotnych. Biezraboćcie pawialičyłasia ŭ Rumynii, Danii, Šwajcaryi, Polščy i Irlandyi, a ŭ inšych eŭrapejskich dziaržawach zaŭważwajecca niaznačnaje źmienšańnie biazraboćcia.

Kamunisty ŭ Francyi nia chočuć brać ułady. Paśla apošnich parlamanckich wybaraŭ u Francyi da ŭłady dajšli socyjalisty. Socyjalisty zaprasili da ŭtwareńnia ŭradu supolna z imi kamunistaŭ, ale kamunisty naadrez ad ułady admowilisia.

Madziarskija fašysty padhataŭlali „pachod na Budapešt.“ Madziarski ŭrad wydaŭ kamunikat, u jakim skazana, što madziarskija fašysty padhataŭlali wa ŭsim krai wialikuju arhanizacyju pachodu na Budapešt, jaki mieŭsia adbycca 1 traŭnia. Pachod hety mieŭ namier zachapić uładu ŭ Madziarščynie. Palicyja ab hetym pryhataŭleńni dawiedałasia i ŭsie namiery fašystaŭ raźbiła.

Balšawiki „biez portak“. Balšawickaja hazeta „Izwiestija“ padaje, što ŭ Sawietach adčuwajecca niedachwat portak. Pryčynu niedachopu portak „Izwiestija“ prypiswaje niadobramu wykanańniu planu šyćcia wopratki.

Z KRAJU

Wialiki pažar u Dawidharadku. U sieradu 6 traŭnia sioleta ŭ miastečku Dawidharadku na Paleśsi wybuch wialiki pažar, padčas jakoha zhareła bolej 1000 budynkaŭ. Zhinuła ŭ ahni tak-ža i staraja, majučaja wialikuju histaryčnuju wartaść, prawasłaŭnaja carkwa, pabudawanaja na Zamkawaj hary, na wysokim bierazie rečki Horynia, ŭ tym miescy, dzie kaliś stajaŭ zamak dawidharadzkoha kniazia Jarasławiča. Jak padajuć hazety, u časie pažaru zhareła adna žančyna i niekalki dziaciej. Pažar heny pazbawiŭ strachi nad haławoj 500 siemjaŭ. Straty ad pažaru abličajuć na 1000000 zł.

Licytacyja 364 dwaroŭ. Sioleta letam buduć pradany z licytacyi za daŭhi kredytnym i ziamielnym ustanowam 364 dwary, katoryja znachodziacca na terytoryi Biełastockaha, Nawahradzkaha i Wałynskaha wajawodztwaŭ. Ahulny abšar padlahajučych pradažy dwaroŭ abyjmaje 20.000 haktaraŭ. Miž inšym buduć pradany dwary hrafaŭ Patockich, Mikulič-Radzieckich i inšych arystakrataŭ.

Da Biełarusaŭ Katalikoŭ!

7 čerwienia sioleta, na św. Trojcu, adbudziecca biełaruskaja pilihrymka ŭ Kalwaryju kala Wilni.

Usich biełarusaŭ, jakija źbirajucca sioleta adwiedać heta światoje miesca, zaklikajem dałučycca da biełaruskaj pilihrymki.

Treba prybywać u Wilniu na 6 čerwienia ŭ subotu. U hety dzień a hadzinie 6 taj wiečaram adbudziecca na wilenskich mohiłkach Rosa adkryćcie i paświačańnie pamiatnika nad hrobam biełaruskaha paeta Kazimiera Swajaka (Ks. K. Stepowiča).

Paśla hetaha ŭ zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury (Zawalnaja 1—1) adbudziecca ŭ čeść taho-ž paeta żałobnaja Akademija.

Nazaŭtra, u dzień św. Trojcy, u kaściele św. Mikałaja a hadz. 7 min. 30 św. Imša, paśla jakoj pracesija ŭ Kalwaryju.

Prybyŭšyja ŭ Wilniu źbirajucca ŭ zali Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury (Zawalnaja 1—1), adkul buduć raźmieščany pa pryhatawanych dla pilihrymaŭ kwaterach.

Biełaruski Kaścielny Kamitet

Wilnia, 7.V.1936.

Biełaruski Instytut
Haspadarki i Kultury
Vilenski Addzieł
Vilnia, Zavalnaja 1—1.

Pračytaj, sam pryjdzi i druhich pryviadzi.

PAWIEDAMLEŃNIE

U niadzielu dnia 17.V.1936 hodu, u zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury pry Zawalnaj wul. 1—1 budzie pračytana nawukowa-papularnaja publičnaja lekcyja na temu:

„Haspadarski ład Biełarusi da kanca XVI stahodździa.“

(1. Prastor i nasielnictwa Biełarusi, 2. Klasawy i nacyjanalny padzieł, 3. Haspadarskaja adzinka ŭ tahočasnym ziemlarobstwie, 4. Ziamielny ład, 5. Ziamielnaja reforma Žyhimonta Aŭhusta — wałočnaja pamiera).

Lekcyju budzie čytać inž. Ad. Klimowič.

Pačatak roŭna a hadzinie 19-aj. Uchod wolny i biaspłatny.

Urad Wilenskaha Addziełu BIHiK.

Выйшаў з друку і прадаецца ўложаны С. Паўловічам новы беларускі ілюстраваны лемантар пад наз.

„Першыя Зерняткі“

беларуская граматка для хатняга навучаньня. З многімі малюнкамі У. Паўлюкоўскага, Я. Драздовіча і іншых. Выданьне Я. Малецкага. Бачын 96, фармат 8°. Ёсьць гэта прыгожая кніжыца для дзяцей і старэйшых. Купіць можна ў кожнай беларускай кнігарні ў Вільні і на правінцыі. Цана пры выпісваньні з перасылкай: да 10 экз. па 50 гр., ад 10 да 20 — 45 гр., ад 20 да 50 — 40 гр., ад 50 і ўзвыш — 35 гр. Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „Пагоня“ Вільня, Завальная 1.

Пісьмы з вёскі

Беларуская сьведамасьць расьце.

Сенкевічы, Косаўскага пав. Нашая вёска мае каля 130 хат. Жыхарамі яе зьяўляюцца праваслаўныя беларусы і належаць яны да Алісееўскага прыходу, каторага настаяцелем ёсьць поп-маскаль, які няпрыхільна адносіцца да сьведамых беларусаў і гэткімі адносінамі адпіхае іх ад царквы.

У нас пасьля закрыцьця гуртка Т. Б. Ш. усё беларускае было прыціхшы на нейкі час. Цяпер, аднак, беларуская нацыянальная сьведамасьць сярод нашага насельніцтва ўзрастае. У нашай вёсцы ёсьць многа моладзі і старэйшых — сьведамых беларусаў, якія хочуць залажыць гурток БІГіК. Гурток такі ёсьць у нас неабходны, бо беларускіх арганізацыяў ніякіх няма ў нашай вёсцы, а заснаванае ў 1932 годзе „Кола млодзежы вейскей“ нічога карыснага нам ня прыносіла і ўвосені 1935 году разваліласся. Крыху дрэнна, што ў нашай вёсцы моладзь грае ў лато, марнуючы дарма час, а няраз і грошы.

Дарагая моладзь! Давай лепей возьмемся за лепшую працу, у каторай мы прынясём карысьць сабе і нашай бацькаўшчыне. Селянін.

„Prawincyjanalnyja kanfiskatary“.

Harodniki, Kucewickaj woł. Budučy na słužbie ŭ pana ŭ dwary ja na adras henaha dwara wypisaŭ „Biełaruskuju Krynicu“, jakaja čamuści nie dachodziła da maich ruk. Dumaŭ ja, što može ŭ hetym winawata pošta, ale pa niejkim časie dawiedaŭsia ad dwornaj słužby, što pošta hazetu akuratna prywozić u dwor i tolki tut jaje chtoś „kanfiskuje“. I praŭda, adnaho razu ja prypadkowa zaŭważyŭ, što majej hazetaj, parwanaj na kuski, hulali panskija dzieci. Ab hetym ja panom nie adważyŭsia skazać, ale prasiŭ na pošcie, kab mnie ad henaha času asabista daručali hazetu, padajučy pry hetym wyšejuspomnienuju pryčynu. U kancy hodu 1935 mianie za wypiswańnie „Bieł. Krynicy“ zwolnili pany sa słužby ŭ dwary. Ja heta zrazumieŭ tak, što pany nadta bajacca, kab sielanin nie ŭświedamiŭsia i nie paznaŭ, čamu heta pan žywie nadta dobra, a jon — sielanin nadta drenna i kab u wyniku hetaha nie pačaŭ jon budawać sabie nowaha sprawiedliwiejšaha i lepšaha žyćcia. Ale hetaha pany nia paŭstrymajuć, bo ŭ narodzie ŭžo z wialikim razhonam pašyrajecca i nacyjanalnaja i socyjalnaja świedamaść. Sialanie prabudžajucca i škidajuć z swaich wačej zasłonu, jakaja im zakrywała praz całyja wiaki świato praŭdy. Waŭčok.

ад стала і кіруецца да кухні. На парозе спатыкае Мар'яну) Толькі вас, мама, і не хапае ля стала.

Мар'яна — Іду, іду сынок!

Пятрусь — *(робячы ёй месца ля Рыгора)* Сюды, сюды хадзеце цётка! Вось тут двое вас старых між намі маладымі за сталом будзеце выглядаць, як дзесь у гаю два старыя дрэвы між маладняка.

Ганулька — Паслухала-б Верачка, як прыгожа гаворыць сяньня Пятрусь! А гэта яна казала, што ты гаварыць ня ўмееш. Як прыйдзе, кажа — дык і сядзіць моўчкі.

Пятрусь — *(наліваючы чаркі)* Дурны быў, дык і маўчаў. Ёй трэба, відаць, было перадусім прыгожых слоў; хоць і пустых. А я ня гаварыў, а моўчкі кахаў. Моцна, шчыра кахаў! Думаў, што яна адчуе, зразумее бяз слоў. А каб рабіў наадварот, дык хто ведае?

Васіль — Кінь, Пятрусь! Апрача прыгожых слоў гэтакім людзям трэба яшчэ — лёгкі хлеб.

Пятрусь — Зрэшта, годзі аб гэтым!... Кожнаму будзе—што будзе!... Маё відаць, яшчэ не прыйшло, дык пакінем аб ім гутарку! *(падымае чарку)* Гэй, музыкі, весялей! *(моладзь бярэцца за чаркі і ўстае)* За здароўе і шчасьце маладой пары! Няхай жывуць!

Усе — Няхай жывуць!!! *(п'юць)*.

Моладзь пяе песьню, і западае заслона.

АКТ II.

Лявон Мутэрка — багаты селянін 60 г.
Альжбета — яго жонка 45 г.
Верачка — іх дачка.
Пан Крукоўскі — дарожны майстра, былы ахвіцэр, 35 г.
Язэп Гарачка — селянін 50 г. — гаспадар, у якога Крукоўскі кватэруе і яго дружка.

Рэч дзеіцца аднначасна з першым актам.

Сцэна—багатая, вясковая хата.

На левым баку ад гледзельнікаў: камода, канапа і дзьверы ў пакой Верачкі. У глыбіне сцэны, у сярэдняй сьцяне — ўходныя дзьверы, на правым баку — дзьверы ў кухню. Стол. Пара крэслаў. У куце ад гледзельнікаў — абраз і гарыць лямпадка.

Зьява 1-я.

Альжбета адна.

Альжбета — *(прыбіраючы па хаце)* Здаецца, ужо усё прыбрала? Цяпер і сьяткаваць магу. Толькі трэба вады занясьці ў пакой Верачкі. Пэўна, прыйшоўшы, захоча рукі памыць. Але нешта яна замарудзіла? Пэўна Ганулька сукенкі ня скончыла? Надта патрэбна чакаць! Дзякаваць Богу, ёсьць што надзець. Навошта стары скупы і благі, а на адзежыну дачцэ не шкадуе. Хоць пабурчыць сваім звычаем, але купіць, што трэба. *(сьцірае пыл з канапы)* Толькі вось за апошні час сама нейкай дзіўнай стала. Усё думае, усё думае штосьць... Стане пры вакне і стаіць, як пень, а такая маркотная, аж сэрца баліць гледзячы. І кніжкі больш ня цікавяць. Анагдай аж плакала чагось. Прыходжу я да яе, а яна стаіць ля вакна, — думала, што думае сваім звычаем. Падхожу бліжэй і кажу — кінь дачушка думаць! Ты-б схадзіла куды навёску! — Глянула, — а ў яе поўныя вочы сьлёз! Запыталася, — што табе дачушка? Мо' трэба чаго? Мо' скрыўдзіў хто? Мо' бацька злаіў? Бо ён, вядома просты, стары, — дзе яму зразумець яе далікатную, адукаваную... Чуць што скажа; яму здаецца панашаму і нічога, а яна і закрыўдзіцца. Сваё роднае дзіцянё, на руках яе вынасіла, а паглядзець, бы ня нашага роду, бы ня мужыцкая...

Дык вось, пытаюся анагдай, а яна кажа, не, мамачка, нічагуткі мне ня трэба... І ня скрыўдзіў ніхто. — Сама кажа, усьміхаецца, а сьлёзы, як гарох, так і коцяцца. Сьціснула мяне за сэрца! Але думаю — кіну пытацца, яшчэ горш уквялю. Дзе мне простай і старой зразумець яе цілігэнтную. *(у задуме)*

Штось нядобрае... Бацька нашто няўважны, а і той заўважыў. Анагдай едзе на кірмаш і кажа, — Матка, Верачка штось надта маркотная. Запытайся, мо' купіць што трэба? Запыталася — нічога, кажа, мне ня трэба. — а сама нат' ад акна не адвярнулася. Як глядзела, так і глядзіць. Ды стары не паслухаў, купіў. Шоўку купіў на сукенку. Тады крыху, быццам павесялела, але не надоўга. *(Зноў прыбіраючы)* Вось толькі і вясёласьці, як прыйдзе пан Крукоўскі, а выйдзе, зноў, як у ваду апушчана. Ды і ён нешта апошнім часам стаў рэдка прыходзіць. Штось нядобрае. Штось няладнае.

Ну, але мо' дасьць Бог усё добрым кончыцца, Верачка казала, што сяньня... *(уходзіць Лявон)*.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič